**Ластаўкі**

Сашу было сумна. Ён глядзеў у акно, назіраў, як у двары лётаюць ластаўкі, мошак ловяць. У застрэшку хаты было іх гняздо. Хлопчык любіў назіраць, як птушкі кормяць сваіх птушанятак-жаўтароцікаў. “Нізка лётаюць, напэўна, дождж будзе,” – падумаў хлопчык.

Дзесьці ўдалечыні пачуліся грымоты. З-за гарызонту падымалася цёмна-шэрая хмара, адваёўваючы ў блакітна-васількоВага неба апошнія чыстыя кавалкі. Навальніца набліжалася ўсё бліжэй. Сонца зусім не было бачна: хмара абклала неба з захаду і рухалася на ўсход, вось зараз яна амаль зойме яго ўсё... Грымоты чуліся ўсё выразней, па страсе застукалі першыя дажджавыя кроплі.

Навальніца прыходзіць, займае неба. Яно становіцца цёмным-цёмным, аж чорным, пасля пачынаецца бура: лівень, маланкі, вецер, так што лепш у такі час сядзець у хаце.. Калі-нікалі навальніца кароткая, што гадзіны не пройдзе, як усё сціхне, часам грыміць увесь дзень, так што страшна на вуліцу нос высунуць. Раз грыміць недзе далёка, толькі грукат разносіцца па ўсёй ваколіцы, а іншым разам грыміць зусім вось тут.

Саша адышоўся ад акна, сеў на канапу. Навальніца на яго наводзіла жах. Хлопчыку ўспомнілася мінулагодняя чэрвеньская навальніца, калі ён з бацькамі ехаў з Мінска. Было каля сямі гадзін вечара. На вуліцы парыла. У машыне было душна. Неяк раптоўна сцямнела, неба закрыла фіялетава-чорная хмара. Дождж паліў як з вядра, падняўся моцны вецер. Гром загрымеў зусім побач. Неба пачалі паласаваць маланкі. Хлопчыку здавалася, што ён папаў у фільм жахаў. Дарогі было не відаць.

– Немагчыма ехаць! – сказаў тата. Ён астанавіў машыну на ўскрайку дарогі. – Перачакаем непагоду, потым паедзем.

Было настолькі цёмна, што машыны сунуліся па дарозе з уключанымі фарамі.

– Як ты? Страшна? – спытала мама ў Сашы.

– Не, – адказаў хлопчык, а сам заплюшчыў вочы. У дзесяць гадоў ён лічыў сябе немаленькім ужо, сорамна было прызнавацца ў тым, што яму страшна. Саша ўтульней уладкаваўся ў аўтакрэсле і задрамаў пад ціхую гутарку бацькоў, якія сядзелі спераду.

Нечаканы моцны грукат і яркі свет разбудзілі хлопчыка. Ён не мог зразумець, што зрабілася.

– Мама!!! – закрычаў хлопчык. Моцны боль працяў усё цела, і Саша страціў прытомнасць…

Калі адкрыў вочы, убачыў над сабой белую столь. Хлопчык застагнаў, бо паспрабаваў падняцца. Балела ўсё: рукі, ногі, у баку. Саша зразумеў, што здарылася нешта страшнае. У палату зайшла медсястра.

– Ачнуўся, галубок? Вось добра!!! Зараз доктара пазаву, – усміхнуўшыся, сказала дзяўчына і пайшла хуткім крокам.

Праз некалькі хвілін у дзвярах паказаўся высокі мужчына ў белым халаце. Ён падышоў да хлопчыка.

– Ну, як справы? – спытаў у Сашы. – Балюча? Цярпі, хлапчына! Табе вельмі пашанцавала…

– Дзе мама, тата? Пазавіце іх, калі ласка.

Доктар неяк уважліва глянуў на хлопца, махнуў галавой і выйшаў з палаты. Ён не мог сказаць хлопчыку, што ў іх машыну, не справіўшыся на мокрай дарозе з кіраваннем, урэзаўся грузавік, і бацькі загінулі на месцы. Саша цудам застаўся жыць. Пра гэта яму расказала маміна сястра цёця Аня, якая прыехала назаўтра яго праведаць.

Як жа страшна было пра гэта пачуць! “Як жа мне цяпер жыць? Што са мной будзе?” – са слязьмі на вачах думаў хлопчык.

З бальніцы яго забрала цёця Аня. Вось ужо амаль год Саша жыве ў яе.

З нярадасных думак хлопчыка вывеў моцны грукат за акном. Саша здрыгануўся. “Што гэта можа быць?” – падумаў. Глянуў у акно, але за дажджом нічога не было відаць. Калі дождж сціх, хлопчык выбег на вуліцу. Пад акном ляжала ластаўчына гняздо, на траве куляліся мокрыя птушаняткі, а іх бацькі бездапаможна лёталі побач…

Саша ўзяў у рукі траіх птушанят і панёс у хату. У каробку паслаў мяккую трапачку і паклаў туды ластаўчанят. Мокрыя, маленькія, яны бездапаможна ціўкалі, тулячыся адзін да аднаго. “Чым жа іх карміць?”– падумаў хлопчык. Мошак ён не можа налавіць, а крупы птушаняты есці не будуць.

У пакой зайшла цётка. Убачыўшы птушанят, яна сказала:

– Яны загінуць тут. Мы не зможам ім мошак налавіць. Давай паспрабуем іх пакласці ў другое гняздо. Ластаўкі птушкі дружныя. Выкармяць!

Цёця Аня паставіла лесвіцу, паднялася на некалькі ступенек. Саша падаваў ёй птушанят, а яна клала іх у гняздо. Ластаўкі насіліся па двары, лавілі мошак і адносілі іх у гняздо. І толькі бедныя птушкі з разбуранага гнязда сумна сядзелі на провадзе. Ім не было куды спяшацца. Гнязда не было. А вось “прыёмныя ” бацькі-ластаўкі не маглі зразумець, чаму не паспяваюць

карміць сваё сямейства. Носяць-носяць ежу, а малым усё мала.І тут яны падляцелі да ластавак, якія сядзелі на провадзе, штосьці заклапочана прашчабяталі. Напэўна, дапамогі папрасілі. Дружна лcraталі ластаўкі, учацвярых лягчэй карміць вялікую сямейку. Праз тыдні тры бацькі пачалі вучыць лётаць сваіх птушанят. Саша шчыра радаваўся, што ўсе птушаняты выжылі. А для сябе хлопчык рашыў, што няма сэнсу кожную ноч плакаць па маме і тату. Так, вельмі дрэнна, што іх няма і ніколі не будзе побач. Але ж слязьмі іх не вернеш. Цяпер яго сям’я – цёця Аня і дзядзя Максім, яе муж. Выраслі ж ластаўкі ў прыёмнай сям’і, і ён вырасце!

Што яднае ўсе буры, гэта калі яны заканчваюцца, паветра напоўнена такім пахучым водарам свежасці з ноткамі кветкавага нектару і свежай роснай травы, аж хочацца выврвацца з хаты і басанож бегчы, не спыняючыся, каб дасыта напіцца...

Гэта як паветра пасля навальніцы, як знак таго, што жыццё ідзе. Але, нягледзячы ні на што, Саша памятае і заўсёды будзе памятаць той дзень, тую навальніцу.

***Карабкоў Міхаіл Іванавіч,***
вучань VI класа ДУА «Радзюкоўская базавая школа
Шаркаўшчынскага раёна»